## М – 2. Тэма: Грамадска – палітычны рух (60-ым гг. Х1Хст. – Першыя гады хх ст.)

**ВЭ 0 ІДМ**

**1. Ведаць:**

-асаблівасці сялянскага рабочага і народніцкага руху ў Беларусі ў 60-90-х гг.;

-працэс арганізацыйнага афармлення рабочага, сацыял-дэмакратычнага і нацыянальна дэмакратычнага руху ў 90-ыя гады Х!Х ст. – пачатку ХХ ст.;

-палітычныя партыі ў Беларусі; ідэі, па якіх грунтавалася іх дзейнасць.

**2. Умець:**

-супастаўляць і аналізаваць інфармацыю з розных крыніц, аргументаваць свае адносіны да ацэнак, якія выкладзены ў дадзеных матэрыялах;

- параўноўваць і супрацьстаўляць розныя ідэі і падыходы развіцця гістарычнага працэсу;

- працаваць у групах і парах, развіваць навыкі самакантролю і ўзаемакантролю.

**3**.Выхоўваць адказнасць за вынікі сваей працы і працы свайго таварыша, нацыянальную самасвядомасць.

Пералік вучэбных элементаў модуля:

ВЭ 0 ІДМ.
ВЭ 1 Уводны кантроль.
ВЭ 2 Сялянскі рух і народніцкія арганізацыі ў Беларусі.
ВЭ 3 Рабочы рух і стварэнне сацыял- дэмакратычных арганізацый у Беларусі.
ВЭ 4 Арганізацыйнае афармленне беларускага нацыянальна- дэмакратычнага руху.
ВЭ 5 Рэзюме.
ВЭ 6 Выхадны кантроль.
ВЭ 7 Рэфлексія.

| № модуля | № вучб-нага элемента | Вучэбны матэрыял і зананні да яго | Кіраўніцтва па засваенню матэрыяла |
|---|---|---|---|
| | | - **Ход урока** | |
| | ВЭ 1 | Уводны кантроль.<br>**Заданне 1 (1 бал)**<br>**1**. Успомніце, якія дасягненні меў рабочы і сацыял-дэмакратычны рух у краінах Заходняй Еўропы ў канцы Х1Хст.<br>**2**. Чым адрозніваюцца рэвалюцыйны і рэфармісцкі напрамкі ў сацыялістычным руху?<br>3. Што такое народніцтва? На якой тэорыі грунтавалася яно ідэалагічна? | К.Н. |
| | ВЭ 2 | Сялянскі рух і народніцкія арганізацыі ў Беларусі.<br>**Заданне 2(1 бал)**<br>Якія асаблівасці меў сялянскі рух у Беларусі ў 60-90-х гг.?<br>**Заданне 3 (1 бал)**<br>Прааналізуйце прычыны расколу “Зямлі і волі”.<br>**Заданне 4 (2 балы)**<br>Параўнайце і прааналізуйце праграмы “Народнай волі” і “Чорнага перадзела”. | РП,<br>с. 61<br><br>РП,с. 61-62<br>Р гр.<br><br>РП, с.61-62,<br>Р гр. |
| | ВЭ 3 | Рабочы рух і стварэнне сацыял-дэмакратычных арганізацый у Беларусі.<br>**Заданне 5 (1 бал)**<br>Якія асаблівасці меў рабочы рух у Беларусі ў 60-90-х гг.?<br>**Заданне 6 (2 балы)**<br>Запоўніце табліцу “Палітычныя партыі на Беларусі” і вызначце, у чым заключаецца прынцыповае адрозненне | <br><br>РП, с.63<br>Уз. К |

<table>
<tr><td></td><td></td><td>паміж народнікамі і сацыял – дэмакратамі.<br><table><tr><td>Дата стварэння</td><td>Назва арганізацыі</td></tr><tr><td></td><td></td></tr></table></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>ВЭ 4</td><td>Арганізацыйнае афармленне беларускага нацыянальна – дэмакратычнага руху.<br>Заданне 7 (1 бал)<br>Заслухайце паведамленне вучня аб стварэнні Беларускай рэвулюцыйнай грамады (БРГ ), назавіце асноўныя ідэі БРГ па палітычнаму, аграрнаму і нацыянальнаму пытаннях.</td><td>С.К.</td></tr>
<tr><td></td><td>ВЭ 5</td><td>Рэзюмэ</td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>ВЭ 6</td><td>Выхадны кантроль.<br>Кантрольныя заданні:<br>1.”Зямля і воля” – гэта:<br>а) назва царскага маніфесту аб скасаванні прыгоннага права;<br>б) назва арганизацыі народнікаў;<br>в) беларускае народнае свята.<br><br>2. Расийская сацыял – дэмакратычная рабочая партыя аб’ядноўвала:<br>а) прыхільникаў царызму;<br>б) прыхільникаў сацыял- дэмакратыі;<br>в) аматараў народных спеваў.<br><br>3. Аляксандра II забіў:<br>а) М.Судзілоўскі;<br>б) І.Грынявіцкі;<br>в) А.Бонч- Асмалоўскі.<br>4. Якія формы барацьбы былі найбольш характэрны для рабочага руху канца Х1Х – пачатку ХХст.<br>а) мітынгі;<br>б) хваляванні;<br>в) дэманстрацыі;<br>г) эканамічныя стачкі;<br>д) палітычныя забастоўкі?<br><br>5. Дапоўніце інфармацыю:<br>1)У 1897г. у Вільні з прадстаўнікоў яўрэйскіх сацыял- дэмакратычных груп Беларусі, Літвы, Польшчы ўтварыўся...<br>2) У 1898г. У Мінску адбыўся з’езд сацыял- дэмакратычных арганізацый, на якім было прынята рашэнне аб утварэнні...<br>6. У Беларусі народніцкі рух распаўсюджаны слаба таму, што:<br>а) недастатковая колькасць разначыннай інтэлегенцыі;<br>б) беларускія сяляне жылі лепш, чым у Цэнтральнай Расіі;<br>в) адсутнасць вышэйшых навучальных устаноў.</td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>ВЭ 7</td><td>Рэфлексія.<br>Запоўніце табліцы зваротнай сувязі (настаўнік- вучань)<br><br><table><tr><td>Што я запомніў(ла) на уроку</td><td>Што я зразумеў(ла)<br>У чым разабраўся (лася)</td><td>Што мне спадабалася.<br>Што выклікала цікавасць</td></tr></table></td><td></td></tr>
</table>

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

**М –3. Тэма: Грамадска – палітычная барацьба ў 1905 –14гг.**

ВЭ 0 ІДМ

**1**. Ведаць:

- грамадска – палітычныя лагеры, якія дзейнічалі ў рэвалюцыі 1905 – 07 гг., іх сацыяльны і партыйны склад, да якіх яны імкнуліся;

-вызначыць прычыну, характар, рухаючыя сілы, вынікі і асаблівасці рэвалюцыі 1905 – 07 гг.

- засвоіць характарыстыку грамадска- палітычнай і ідэалагічнай сітуацыі на Беларусі ў 1908 – 14 гг.;

- вызначаць ролю газеты "Наша ніва" ў развіцці беларускага нацыянальна – культурнага руху.

**2**. Умець:

- сістэматызаваць і абугальняць гістарычныя факты, з'явы і рабіць на гэтай падставе аргументаваныя высновы;

- параўноваць гістарычныя факты і з'явы;

- выяўляць дынаміку і на гэтай падставе вызначыць тэндэнцыю гістарычнага развіцця;

- развіваць навыкі працы ў групах, у пары, навыкі самакантролю і ўзаемакантролю.

ВЭ 0 ІДМ

ВЭ 1 Уводны кантроль.

ВЭ 2 Складванне рэвалюцыйнай сітуацыі. Тры лагеры ў ідэйна – палітычнай барацьбе.

ВЭ 3 Дынаміка і формы рэвалюцыйнага руху ў перыяд рэвалюцыі 1905-07 гг. Вызваленчы рух у студзені – верасні 1905г.

ВЭ 4 Найвышэйшы уздым рэвалюцыйнай барацьбы. Узнікненне буржуазных і манархічных палітычных партый.

ВЭ 5 Адступленне рэвалюцыі і яе вынікі.

ВЭ 6 Важнейшыя асаблівасці рэвалюцыйнага і нацыянальна- культурнага руху ў Беларусі пасля рэвалюцыі 1905 –07гг.

ВЭ 7 Выхадны кантроль.

ВЭ 8 Рэфлексія.

| № модуля | № вучб-нага элемента | Вучэбны матэрыял і зананні да яго | Кіраўніцтва па засваенню матэрыяла |
|---|---|---|---|
| | | **Ход урока.** | |
| | ВЭ 0<br>ВЭ 1 | ІДМ<br>Уводны кантроль<br>**Заданне 1 (1 бал)**<br>**1**. Якія супярэчнасці сацыяльна – эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця Расіі існавалі ў другой палове Х1Х – пачатку ХХ ст.? Чым яны былі выкліканы? | КН |

<table>
<tr><td></td><td></td><td>2. Якія палітычныя партыі ўзніклі ў Расіі яшчэ да рэвалюцыі 1905 – 07гг.?</td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>ВЭ 2<br><br>ВЭ 3<br><br>ВЭ 4</td><td>Складванне рэвалюцыйнай сітуацыі. Тры лагеры ў ідэйна-палітычнай барацьбе.<br>Заданне 2 (1 бал)<br>Запоўніце ў сшытку наступную схему:<br><br><br>Заданне 3 (1 бал)<br>Якія мэты перад сабою ставілі прадстаўнікі кожнага палітычнага лагера?<br><br>Дынаміка і формы рэвалюцыйнага руху у перыяд рэвалюцыі 1905-07гг.. Вызваленчы рух у студзені 1905г.<br>Заданне 4 (1 бал)<br>Прааналізуйце дынаміку і формы рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту Беларусі ў студзені – верасні 1905 года.<br><br>Заданне 5 (1 бал)<br>Чаму на Беларусі рэвалюцыйныя падзеі на сяле былі больш моцнымі, чым у горадзе?<br><br>Найвышэйшы ўздым рэвалюцыйнай барацьбы.Узнікненне буржуазных і манархічных партый.<br><br>Заданне 6 (1 бал)<br>Якія органы рэвалюцыйнай улады былі створаны восенню 1905г.<br><br>Заданне 7 (1 бал)<br>Заслухайце паведамленне “Курлаўскі растрэл”<br>Чым былі выкліканы гэтыя падзеі?<br><br>Заданне 8 (1 бал)<br>Запоўніце ў сшытку табліцу.<br><table><tr><td>Назва партыі</td><td>Палітычная праграма</td><td>Сацыяльны склад</td></tr><tr><td></td><td></td><td></td></tr></table>Заданне 9 (1 бал)<br>Абазначце падзеі I рускай рэвалюцыі на графіку.<br>Прааналізуйце ход падзей.<br><br><br>1. Пачатак дзейнасці I Думы<br>2.Крывавая нядзеля.<br>3 Пачатак дзейнасці. II Думы<br>4.Снежаньская палітычная стачка.<br>5. Роспуск I Думы.</td><td>РП, с. 69-70<br><br>Уз. К<br><br>РП,с.67-68<br><br>Уз.К<br><br>РП,с. 68<br><br>СК<br><br>РП,с. 69-70<br><br>Р у парах</td></tr>
</table>

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | 6.Роспуск II Дзяржаўнай думы.Дзяржаўны пераварот.<br>7.Кастрычніцкая палітычная стачка<br>8. Рэвалюцыйны ўздым вясною-летам 1905г. | |
| | ВЭ 6 | Важнейшыя асаблівасці рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху пасля рэвалюцыі 1905 – 07 гг.<br>**Заданне 10 (1бал)**<br>Дайце характарыстыку грамадска – палітычнай і ідэалагічнай сітуацыі на Беларусі ў 1908-14гг.<br>**Заданне 11 (1 бал)**<br>Якую ролю адыграла “Наша ніва” у развіцці беларускага нацыянальна- культурнага руху? | Р гр., с.71<br><br>Р гр, с.71-78 |
| | ВЭ 7 | Выхадны кантроль<br>Кантрольныя заданні.<br>**1**.Савет рабочых дэпутатаў – гэта:<br>а) прапанова рабочых фабрыканту;<br>б) выбарны орган самакіравання рабочых;<br>в) форма арганизацыі працы на прадпрыемствах.<br>**2**.Курлоўскиі расстрэл адбыўся:<br>а) у Мінску;<br>б) у Вільне;<br>в) у Полацку.<br>**3**. Цар Мікалай II у Маніфесте 17 кастрычніка 1905г. абяцаў народу:<br>а) палітычныя правы і свабоду;<br>б) абмежаваць сваю уладу;<br>в) празначыць выбары ў Дзяржаўную думу;<br>г) надзяліць сялян зямлей;<br>д) без згоды Дзяржаўнай думы не прымаць новых законаў.<br>**4**. Дзяржаўная дума пачала работу:<br>а) у лютым 1906г.;<br>б) у красавіку 1906г.;<br>в) у чэрвені 1906г.<br>**5**. Галоўным пытаннем у рабоце I Думы было:<br>а) аграрнае;<br>б) абмежаванне самадзяржаўя;<br>в) адносіны рабочых і прадпрымальнікаў.<br>**6**. Дайце ацэнку вынікаў рэвалюцыі з пункту гледжання:<br>а)манархічнага (урадавага) лагера;<br>б) буржуазна- ліберальнага лагера;<br>в) рэвалюцыйнага лагера. | |
| | ВЭ 8 | Рэфлексія.<br>**1**. Ці ўсе задачы, пастаўленыя намі ў пачатку ўрока дасягнуты?<br>**2**. Якое пытанне вам прыйдзецца самастойна дапрацоўваць дома?<br>**3**. Якія пытанні і заданні вам здаліся найбольш цікавымі? Чаму?<br>**4**. Ці спатрэбяцца вам веды, атрыманыя на ўроку? | |

**М –4 . Тэма 4. Беларусь у гады першай сусветнай вайны**

**1. Ведаць:**

- галоўныя прычыны першай сусветнай вайны;
- становішча Беларусі ў час вайны;
- прычыны ўздыму і асаблівасці рабочага, сялянскага і салдацкага руху, накірункі і змест беларускага нацыянальнага руху ў перыяд першай сусветнай вайны.

**2. Умець:**

- - характарызаваць палітычнае становішча краіны з апорай на гістарычную карту;
- сістэматызаваць і абагульніць гістарычныя факты, з явы і рабіць на гэтай падставе аргументаваныя высновы;
- вызначыць гістарычнае значэнне вывучаемых падзей, з яў, працэсаў.

ВЭ 1 Прычыны і пачатак першай сусветнай вайны. Захоп немцамі Заходняй Беларусі.
ВЭ 2 Становішча Беларусі ў гады першай сусветнай вайны.
ВЭ 3 Рабочы, сялянскі і салдацкі рух.
ВЭ 4 Беларускі нацыянальны рух.
ВЭ 5 Выхадны кантроль
ВЭ 6 Рэфлексія.

| № модуля | № вучб-нага элемента | Вучэбны матэрыял і зананні да яго | Кіраўніцтва па засваенню матэрыяла |
|---|---|---|---|
| | ВЭ 1 | Ход урока<br>Прычыны і пачатак першай сусветнай вайны. Захоп немцамі Заходняй Беларусі.<br>**Заданне 1 (1 бал)**<br>Якія меліся супярэчнасці паміж буйнейшімі імперыялістычнымі дзяржавамі на пачатку ХХ ст. | СР |
| | | **Заданне 2 (1 бал)**<br>Калі ў першую сусветную вайну ўступіла Расія? | РС |
| | | **Заданне 3 (2 балы)**<br>Калі і як адбыўся Свянцянскі прарыў германскага войска? | РП с.73-74 |
| | ВЭ 2 | Становішча Беларусі ў гады першай сусветнай вайны.<br>**Заданне 4 (2 балы)**<br>Апішыце, як змянілася становішча насельніцтва Беларусі з пачаткам першай сусветнай вайны. | РП с.74-75 |
| | | **Заданне 5 (1 бал)**<br>Чаму з пачаткам вайны ў заходніх губернях Расіі быў усталяваны жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым? | Уз К |
| | ВЭ 3 | Рабочы, сялянскі і салдацкі рух.<br>**Заданне 6 (1 бал)**<br>Назавіце прычыны ўздыму і асаблівасці рабочага, сялянскага і салдацкага руху ў гады вайны. | Ргр.с75-77 |
| | ВЭ 4 | Беларускі нацыянальны рух.<br>**Заданне 7 (2 балы)**<br>Чаму Германія аддавала перавагу польскаму и літоўскаму нацыянальнаму руху перад беларускім? | Ргр.с77-78 |
| | ВЭ 5 | Выхадны кантроль.<br>Кантрольныя заданні.<br>1. Адной з ваенных аперацый, якая праводзілася на тэрыторыі Беларусі была:<br>а) “Брусілаўскі прарыў”;<br>б) Нарачанская наступальная аперацыя;<br>в) бітва перад Вердэнам.<br>2. Першая сусветная вайна пачалася: | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | ВЭ 6 | а) 1 верасня 1939г.;<br>б) 1 ліпеня 1907г.;<br>в) 1 жніўня 1914г.<br>3. Рэквізіцыі былі звязаны:<br>а) з папаўненнем арміі людскімі рэзервамі;<br>б) аснашчэннем арміі зброяй і баепрыпасамі;<br>в) забеспячэннем арміі прадуктамі харчавання.<br>4. Мабілізацыя – гэта:<br>а) прымусовае адабрэнне маёмасці на патрэбы арміі;<br>б) прызыў мужчын у армію;<br>в) звальненне з ваеннай пасады;<br>5. Дзеячы беларускага нацыянальнага руху ў сувязі з пачаткам вайны:<br>а) падтрымалі царскі ўрад;<br>б) занялі нейтральную пазіцыю;<br>в) выступілі з асуджэннем вайны.<br>Рэфлексія. | |

**Тэма 5. Лютаўская буржуазна – дэмакратычная рэвалюцыя ў Беларусі**

ВЭ 0 ІДМ
1.Ведаць:
а) прычыны, характар, рухаючыя сілы і асаблівасці Лютаўскай рэвалюцыі;
б) развіццё нацыянальнага руху ў Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі, прычыны расколу БСГ.
2. Умець:
1) аналізаваць, параўноўваць, абагульняць факты;
2) устанаўліваць своеасаблівасць і гістарычную абумоўленасць падзей;
3) састаўляць сінхраністычныя табліцы;

Пералік вучэбных элементаў модуля:
ВЭ 1 Звяржэнне самадзяржаўя. Утварэнне двоеўладдзя.
ВЭ 2 Утварэнне новых органаў улады.
ВЭ 3 Дэмакратызацыя грамадства. Розныя погляды на далейшае развіццё краіны.
ВЭ 4 Палярызацыя палітычных сіл краіны. Уздым беларускага нацыянаьнага руху.
ВЭ 5 Выхадны кантроль.
ВЭ 6 Рэфлексія.

| № модуля | № вучб-нага элемента | Вучэбны матэрыял і зананні да яго | Кіраўніцтва па засваенню матэрыяла |
|---|---|---|---|
| | ВЭ 1 | Ход урока<br>Звяржэнне самадзяржаўя. Утварэнне двоеўладдзя.<br>**Заданне 1 (1 бал)**<br>Чаму ў Расіі буржуазна- дэмакратычная рэвалюцыя была непазвежнай?<br>**Заданне 2 (1 бал)**<br>Якія былі прычыны Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі?<br>**Заданне 3 (2 балы)**<br>Параўнайце Лютаўскую рэвалюцыю з рэвалюцыяй 1905-07гг. Па наступнаму плану:<br>а) характар;<br>б) мэты;<br>в) вынікі. | КН<br>Уз. К<br>РП<br>С. 78 –79 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | ВЭ 2 | Утварэнне новых органаў улады ў Беларусі. | |
| | ВЭ 3 | **Заданне 4 (2 балы)**<br>Запоўніце схему:<br><br>Дэмакратызацыя грамадства. Розныя погляды на далейшае развіццё краіны.<br>**Заданне 5 (1 бал)**<br>Параўнайце і прааналізуйце пазіцыі беларускіх партый рознага палітычнага накірунку па пытаннях:<br>а) адносіны да вайны;<br>б) адносіны да Часовага ўрада;<br>в) будучыня Расіі;<br>г) нацыянальнае пытанне.<br>**Заданне 6 (1 бал)**<br>Растлумачце адносіны бальшавікоў да Часовага ўрада і працягу вайны? | РП<br>С 79<br><br>РП с. 81<br><br>Р гр. |
| | ВЭ 4 | **Заданне 7 (1 бал)**<br>Якія пераходы меры ад капіталізму да сацыялізму прапаноўвалі бальшавікі?<br>Палярызацыя палітычных сіл у Беларусі. Уздым беларускага нацыянальнага руху.<br>**Заданне 8 (1 бал)**<br>Заслухайце паведамленне вучня і адкажыце на пытанне:<br>Якія былі прычыны расколу БСГ? | Р гр.<br><br>СК |
| | ВЭ 5 | **Заданне 9 (1 бал)**<br>Якія падзеі station: станоўча паўплывалі на рост аўтарытэту партыі бальшавікоў?<br>Выхадны кантроль. Кантрольныя заданні:<br>1. Дэпутаты Саветаў: а) выбіраліся; б) прызначаліся Часовым урадам; в) прызначаліся партыйнымі арганізацыямі?<br>2. Калі перамагла Лютаўская рэвалюцыя ў Расіі:<br>а) 27 лютага 1917г.; б) 5 сакавіка 1917г.; в) 15 сакавіка 1917г.;<br>3. Хто узначаліў Беларускі нацыянальны камітэт:<br>а) М.В.Фрунзе; б) Язэп Лёсік; в) Скірмунт Р.?<br>4. Калі быў створаны Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў: а) 1 сакавіка 1917г.; б) 4 сакавіка 1917г.;<br>в) 25 сакавіка 1917г.?<br>5. Асаблівасцю палітычнай сітуацыі на Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі была: а) наяўнасць Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў; б) адсутнасць сітуацыі двоеўладдзя; в) нацыянальны фактар? | СР сш<br>С. 83 |
| | ВЭ 6 | 6. Цэнтральная рада беларускіх арганізацый створана па ініцыятіве: а) БСГ; б) РСДРП(б); в) партыі эсэраў?<br>Рэфлексія<br>Табліца зваротнай сувязі: | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Што я запомніў (ла) на ўроку<br>Што я зразумеў (ла)<br>Што мне спадабалася, выклікала цікавасць | |